**У Касцюковічах абрадавая праграма “Сарокі”**
**сабрала выхаванцаў школьнага лагера**



На пляцоўцы раённага Цэнтра культуры г. Касцюковічы прайшло сапраўднае свята, якое перанесла юных гасцей у свет продкаўскіх традыцый. Для выхаванцаў школьнага лагера была прадстаўлена абрадавая праграма “Саракі”, прысвечаная дню веснавога раўнадзенства і традыцыйнаму закліканню вясны.

Усё дзейства разгарнулася на ўтульнай пляцоўцы перад уваходам у Цэнтр культуры. Галоўнымі дзеючымі асобамі праграмы сталі Гаспадыня, вясёлы Дзяцька Сымон і доўгачаканая Вясна. Разам з артыстамі хлопчыкі і дзяўчынкі з захапленнем уключыліся ў старажытны абрад. Усе разам яны голасна клікалі вясну, прасілі сонейка хутчэй абудзіць зямлю ад зімовага сну і шчодра абсагрэць яе сваім цяплом. Кожны ўдзельнік адчуў сябе часткай вялікага карагода.

Сапраўдным цэнтрам свята стала коле са стужкамі — сімвал сонца і кругавароту жыцця. Вакол яго дзеці разам з героямі вадзілі харавод, заклікаючы: “Прыйдзі, вясна красна, хадзі да нас гуляці, карагод спраўляці!” Не абышлося і без любімых народных забаў. Для школьнікаў правялі цэлую серыю гульняў, якія спадабаліся ўсім без выключэння. Дзеці з азартам імітавалі птушак у гульні «Птушкі», выяўлялі спрыт у «Ручайку», весяліліся

падчас гульні «Венік», а таксама паказалі сябе сапраўднымі знаўцамі хуткасці і ўважлівасці ў гульні «Бусел».






Центр культуры




Центр культуры




OOPS!


Центр культуры





Па завяршэнні абрадавай часткі і гульняў Вясна і Гаспадыня не пакінулі гасцей без пачастункаў. Па традыцыі, якая ідзе яшчэ ад нашых продкаў, юныя ўдзельнікі атрымалі абрадавае печыва —кулачкі, выпечаныя ў форме птушак. Лічыцца, што такія “жаваранкі” або “сарокі” нясуць на крылах цяпло і вясну.

Цудоўныя музычныя нумары падарылі ўдзельнікі дзіцячага вакальнага ансамбля “Кирмашики” пад кіраўніцтвам Дар’і Лабынцевай. Сваімі запальнымі танцамі гледачоў зачаравала танцавальная група “Free Dance”.

Акрамя музычнай і гульнявой частак, наведвальнікі мелі магчымасць далучыцца да народнай творчасці на выставе дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва раённага Дома рамёстваў. Для ўсіх жадаючых правялі майстар-клас “Птушкі”, дзе можна было навучыцца рабіць паперовых птушак і пазнаёміцца з тонкасцямі разьбы па дрэве.

Мерапрыемства атрымалася яркім, шумным і вельмі пазнавальным. Яно не толькі падарыла дзецям цудоўны настрой, але і дапамагло ім далучыцца да багатай духоўнай спадчыны беларускага народа.

*Ксенія Лістранценка, метадыст па мультымедыйных тэхналогіях і тэхнічных сродках раённага Цэнтра культуры ДУК «Цэнтралізаваная клубная сістэма Касцюковіцкага раёна»*